Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# ПАРТЫЗАН

Орган Калінкавіцкага РК КП(б)Б

№ 18(281) | Субота, 18 Верасня | 1943 года.

**ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**

У баях за вызваленне г. Новарасійска нашы войскі разграмілі 73 пяхотную дывізію немцаў, 4 і 101 горна-стралковыя дывізіі немцаў, 4 горна-стралковую дывізію румын і партавыя каманды марской пяхоты немцаў.

## СЛАВА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ! НАШЫ ВОЙСКІ ЗАНЯЛІ КАНАТОП, НЕЖЫН, НОВАРАСІЙСК, БРАНСК

### На франтах айчыннай вайны

(агляд з 9 па 17 верасня г. г.)

Войскі Паўночна - Каўказскага фронта ў узаемадзеянні з Чорнаморскім флотам пасля пяцідзённых жорсткіх баёў авалодалі горадам і партом НОВАРАСІЙСК.

На ўзбярэжжы Азоўскага мора вызвалеп горад і порт Марыупаль. На Запарожскім і Мелітопальскім напрамках нашы войскі авалодалі горадам Гуляй-Поле і раённым цэнтрам Днепрапятроўскай вобласці Пакроўскае, райцэнтрам і чыгуначнай станцыяй Запарожскай вобласці Куйбышэва.

На Кіеўскім напрамку заняты гарады: Бахмач, Канатоп, Ромны, чыгуначны вузел і горад Нежын —важнейшы апорны пункт абароны немцаў на шляху да Кіева. Паўднёва-заходнее Харкава вызвалены гарады Валадага, Валкі.

На Паўлаградскім напрамку нашы войскі занялі звыш 670 населеных пунктаў, у тым ліку горад Барвенкова, Лозовая.

На Прылукскім напрамку занята звыш 460 неселеных пунктаў, сярод іх гарады: Гадзяч, Лохвіца, Ічня, райцэнтр Сінча.

Войскі Бранскага фронта, працягваючы развіваць наступленне, паспяхова фарсіравалі раку ДЗЕСНА адначасовым ударам з поўначы і ўсхода 17 верасня, зламіўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі важнейшымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на рубяжы гэтай ракі, буйнымі прамысловымі цэнтрамі — БРАНСК і БЕЖЫЦА.

У баях за гарады Бранск і Бежыца разгромлены 339, 110, 707, 95, 299, 134 пяхотныя дывізіі немцаў.

Паўночнее Бранска заняты гор. Дзядзькова, паўднёвей Бранска горад Ноўгарад-Северскі.

За час з 8 па 17 верасня на ўсіх напрамках фронта нашымі войскамі вызвалена больш 2370 населеных пунктаў. За гэты час знішчана 425 нямецкіх танкаў і 344 самалёты.

### Прысваенне іменаванняў воінскім злучэнням і часцям

У азнаменаванне атрыманай перамогі ў баях за вызваленне гарадоў Канатоп і Бахмач Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна прысвоена найменаванне злучэнням і часцям:

«Канатопскіх»

143 стралковай дывізіі, 280 стралковай дывізіі, 65 Гвардзейскаму мінамётнаму палку.

«Бахмачскіх»

75 Гвардзейскай стралковай дывізіі, 132 стралковай дывізіі, 221 бамбардыровачнай авіяцыйнай дывізіі, 3 Гвардзейскай лёгка-артылерыйскай брыгадзе, 56 Гвардзейскаму мінамётнаму палку.

Злучэнням і часцям, якія найбольш вызначыліся ў баях за вызваленне г. Ноўгарад - Северскі, прысвоена найменаванне:

«Ноўгарад-северскіх»

102 Далёка-ўсходняй стралковай дывізіі, 140 Сібірскай стралковай дывізіі, 162 стралковай дывізіі, 478 мінамётнаму палку, 120 знішчальнаму артылерыйскаму палку, 94 Гвардзейскаму мінамётнаму палку, 235 зенітнаму артылерыйскаму палку, 14 інжынерна-сапёрнай брыгадзе, 324 інжынернаму батальёну.

Акрамя таго, у баях пры фарсіраванні ракі Дзесна адлічыліся:

Чырвонасцяжная Сеўская стралковая дывізія, 37 Гвардзейская стралковая дывізія, 30 стралковая дывізія, 73 стралковая дывізія, 137 стралковая дывізія, 8 стралковая дывізія, 74 стралковая дывізія, 6 асобны артылерыйскі полк, 1168 цяжкі артылерыйскі полк, 6 асобная інжынерна-сапёрная брыгада, 7 штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада, 9 асобны пантонна - маставы батальён, 49 асобны пантонна-маставы батальён, 50 пантонна-маставы батальён.

Найбольш адлічыўшымся ў баях за вызваленне горада Новарасійск, 318 стралковай дывізіі, 3 Чырвонасцяжнай асобнай марской брыгадзе, 5 Гвардзейскай танкавай брыгадзе, 290 асобнаму стралковаму палку войск НКВД, 393 асобнаму батальёну марской пяхоты, 11 штурмавой авіяцыйнай дывізіі, 88 Гвардзейскаму знішчальнаму авіяцыйнаму палку, 889 начному лёгка-бамбардыровачнаму авіяцыйнаму палку, 2 брыгадзе тарпедных кацераў, 1 Чырвонасцяжнаму дывізіёну старажавых кацераў, 4 дывізіёну старажавых кацераў, 81 гаўбічнаму артылерыйскаму палку, 69 Гвардзейскаму артылерыйскаму палку, 1169 пушачнаму артылерыйскаму палку, 108 Гвардзейскаму знішчальнаму супрацьтанкаваму артылерыйскаму палку, 195 горнаўючнаму мінамётнаму палку, 1 Гвардзейскаму асобнаму артылерыйскаму дывізіёну, 251 асобнаму падвіжному артылерыйскаму дывізіёну і 8 Гвардзейскаму мінамётнаму палку прысвоіць найменаванне «Новарасійскіх».

Адлічыўшымся ў баях пры фарсіраванні ракі ДЗЕСНА і за вызваленне гарадоў Бранска і Бежыца, злучэнням і часцям прысвоены найменаванні:

«Бранскіх»

197 стралковай дывізіі, 323 стралковай дывізіі, 3 Гвардзейскай знішчальнай авіяцыйнай дывізіі, 277 інжынернему батальёну, 140 інжынерна-сапёрнаму батальёну.

«Бежыцкіх»

4 стралковай дывізіі, 273 стралковай дывізіі, 313 начной бліжне-бамбардыровачнай дывізіі, 310 Гвардзейскаму мінамётнаму палку, 74 Гвардзейскаму мінамётнаму палку.

За паспяховае фарсіраванне ракі ДЗЕСНА камандармаў, а таксама камандзіраў, адлічыўшыхся злучэнняў і часцей прадставіць да ўзнагароды ордэнам Суворава.

Войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне гарадоў Канатоп, Бахмач, Нежын, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Новарасійск і другіх, абвяшчана падзяка.

жр 3221



# БЯЗЛІТАСНА ПОМСЦІЦЬ НЕМЦАМ ЗА ПРАЛІТУЮ КРОЎ СОВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ

## Узнімайцеся ўсе, як адзін, супроць акупантаў!

У партызанскіх атрадах брыгады К. знаходзяцца дзесяткі былых паліцэйскіх і так званых «казакаў». Са зброяй у руках, яны выконваюць свой свяшчэнны абавязак перад сваім народам, перад Радзімай.

Ніжэй мы друкуем пісьмы былога паліцэйскага і «казака». Іх прыкладу павінны следваць усе тыя, хто яшчэ астаецца служыць Гітлеру, хто думае захаваць сваё жыццё і быць карысным сваей Радзіме.

## Апраўдаю свае давер'е перад народам

Служыць у паліцыю пайшоў я не па добрай сваей воле, а пад пагрозай смерці.

Зразу-ж я ўбачыў, чаго хочуць немцы і для чаго ім патрэбна паліцыя. Нас фашысты направлялі супроць сваіх братоў — партызан, застаўлялі грабіць мірнае насельніцтва і г. д.

З агідай і боллю ў душы глядзеў я на ўсе іх дзеянні і парадкі.

— Не, не туды я папаў, не скарыстаць вам мяне для сваіх мэт,—падумаў я сабе.

У скорым часе я ўзяў 2 вінтоўкі, 400 штук патронаў і прышоў у партызанскі атрад. Тут мяне цёпла сустрэлі і прынялі ў свае рады. Я лёгка ўздыхнуў, што вырваўся з пазорнага месца.

За гэты час я стаў вопытным падрыўніком. Ужо пусціў пад адкос 4 варожыя эшалоны, узрваў 21 рэйку на Н-скай чыгунцы, удзельнічаў у разгроме буйнага нямецка-паліцэйскага гарнізона. За баявыя дзеянні мяне прадаставілі да ўрадавай узнагароды.

Сваей службай у паліцыі я савяршыў буйнейшую памылку ў сваім жыцці, але гэтую памылку я выпраўлю актыўнай барацьбой супроць фашызма і заклікаю паследваць майму прыкладу тых, хто яшчэ астаецца служыць немцу.

У партызанскіх атрадах вас душэўна сустрэнуць нашы браты і сёстры. Агульнымі сіламі будзем дабіваць ворага за чэсць і свабоду нашага народа.

Іван Н.
Н-скі атрад.

## Буду ваяваць яшчэ мацней

Папаўшы ў палон к немцам я нявольна ўступіў у так званыя «казакі». Фашысты думалі з мяне зрабіць здрадніка сваей Радзімы, свайму народу.

Я не мог выконваць злачынных загадаў акупантаў супроць нашага народа. У пачатку бягучага года я пакінуў пазорнае для нас «казакаў» месца і ўступіў у партызанскую сям'ю, сям'ю верных патрыётаў сваей Радзімы, прынёсшы з сабой вінтоўку, 5 гранат і 100 патронаў. У атрадзе мяне цёпла сустрэлі.

Зараз усе маі жаданні, усё мае імкненне—адпомсціць гэтым людаедам за ўсе іх злачынствы, якія прычынілі яны нашаму народу.

Я ўжо ўдзельнічаў у падрыве чыгуначнага маста, знішчыў аўтамашыну з мад'ярамі, узрваў дзесяткі рэйк. Але гэтага мала. У адказ на прызыў франтавікоў—беларусаў буду ваяваць яшчэ мацней. Няхай вораг ведае, што совецкія людзі ніколі не прададу́цца, не здрадзяць сваей Радзіме.

Казакі! Справа немцаў безнадзейна праіграна. Пара апомніцца і вам. Час настаў і не чакае ўсякага выжыдання. Бярыце зброю і пераходзьце да партызан. Тут вас чакаюць. Ужо многа такіх «казакаў», як я, выконваюць доўг перад радзімай у радах народных мсціўцаў.

Віктар Ф.
Н-скі атрад.

## РАСЦЕ БАЯВЫ РАХУНАК БРЫГАДЫ

Байцы і камандзіры брыгады К. кожны дзень наносяць адчувальныя ўдары па камунікацыям ворага.

За прайшоўшы жнівень месяц пушчана пад адкос 4 нямецкіх эшалоны, з ПТР і аўтаматна-кулямётным агнём абстрэлена тры варожыя эшалоны. Пры абстрэле выведзена са строю тры паравозы і 24 вагоны.

За гэты-ж час узрваны тры масты на шасейных дарогах і знішчана 6 нямецкіх аўтамашын з 33 фрыцамі.

## За гонар свайго атрада

Многа слаўных подвігаў маюць комсамольцы нашага атрада.

Сябры—комсамольцы Іван Н. і Міхаіл К. маюць на сваім баявым рахунку спушчаных пад адкос 6 нямецкіх эшалонаў. Баявая група з пяці чалавек разам з падрыўніком Уладзімірам В. за апошнія 2 месяцы падарвала 2 воінскія эшалоны ворага і ўзарвала на Н-ай чыгунцы 70 рэйк.

—Я буду біць фашыстаў так, як б'е родная Чырвоная Армія,—гаворыць комсамолец Васіль Г.

І сапраўды б'е. 4 нямецкіх эшалоны ўзарваў ён і абавязаўся да канца верасня пусціць пад адкос яшчэ адзін. Як лепшага байца комсамольская арганізацыя ракамендавала Васіля ў кандыдаты ВКП(б). Многія байцы жадаюць сустрэць прыход Чырвонай Арміі комсамольцамі. За апошнія 2 месяцы наша комсамольская арганізацыя папоўнілася на 12 чалавек.

Нашы комсамольцы свае баявыя справы спалучаюць з агітмасавай работай сярод насельніцтва. Яны чытаюць газеты, зводкі совінформбюро, расказваюць аб герагічных подвігах нашай Чырвонай Арміі на фронце.

Такім чынам наш баявы комсамольскі калектыў заняў першае месца ў брыгадзе і заваяваў пераходныя комсамольскія аўтаматы.

Выконваючы загад правадыра таварыша Сталіна, нашы комсамольцы і надалей будуць трымаць першынство, будуць змагацца за чэсць і гонар свайго атрада.

Уладзімір В.,
Нам. камісара атрада па комсамолу

## ЛЮБОЎ ДА СВАЕЙ РАДЗІМЫ

На высокім палітычным узроўні сярод насельніцтва раёна праведзены чыткі звароту воінаў—беларусаў.

На сходзе вёскі Н. выступіла Марыя Б. Яна заявіла: «Два маіх сына ў Чырвонай Арміі абараняюць нашу Радзіму. Я, маць, тут у тылу ворага, буду ўсім магчымым дапамагаць партызанам. Для Чырвонай Арміі я збяражу 15 пудоў збожжа.

Такія словы можна чуць ад многіх. Гэта яркае сведчанне вялікай любві совецкіх людзей да сваей Радзімы

Аляксей Н.

Рэдкалегія

Д—51 Выданне Калінкавіцкага РК КП(б)Б г. Калінкавічы